В то же время Ливонская рифмованная хроника ничего не сообщает, о дарах со стороны Миндовга, однако вполне определённо указывает на то, что взамен за поддержку со стороны Тевтонского ордена литовский князь пообещал предоставить им во владение ряд территорий, что подтверждается грамотой Миндовга от 1253 года [1, 79; 4, 21–22].

**Заключение.** Как мы видим, основной причиной, побудившей князя Миндовга принять христианство, стала тяжёлая внутриполитическая ситуация в Литве и Жемайтии, вызванная междоусобной борьбой в среде местных нобилей. Поддержка политических оппонентов Миндовга со стороны князей Василько и Даниила Романовичей и начало войны с ними за земли Западной Беларуси заставили литовского князя искать сильного внешнего союзника, которого он нашёл в лице лянтмайстра Тевтонского ордена в Ливонии Андреаса фон Штирлянда.

Условия заключения союза между Миндовгом и Тевтоским орденом предусматривали:

– принятие литовским князем и его супругой католичества;
– предоставление Ордену ряда земельных владений на границе Литвы и Жемайтии;
– признание владений князя королевством и коронацию Миндовга;
– право нового Короля на завоевание и включение в своё королевство земель у язычников;
– оказание военной помощи Миндовгу в борьбе с политическими противниками со стороны Тевтонского ордена.

Фактически, крещение Миндовга сыграло ключевую роль в становлении литовской государственности и образовании Великого княжества Литовского.


1. Livländische Reimchronik. Mit Anmerkungen, Namenverzeichnis und Glossar / Hrsg. von Leo Meyer. – Paderborn: Druk und verlag von Ferdinand Schöning., 1876 – 416 s.
2. Густынская летопись // Полное собрание русских летописей / Под ред. В.А. Кучкина. – СПб.: Дмитрий Буланин, 2003. – Т. 40. – 202 с.
3. Ипатьевская летопись // Полное собрание русских летописей / Под ред. А. А. Шахматова – М.: Типография М.А. Александрова, 1908. – Т. 2. – 624 с.
4. Міндаў, кароль Літовіі, у дакументах і сьведчаньнях / НАН Беларусі, Ін-т гіст; уклад., А. Жлуткі. – Мн.: Тэхналогія, 2005 – 135 с.


## УЦЯГНЕННЕ ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН У КП(б)Б У 1920-Я ГГ.


*А.М. Дулаў*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі савецкая ўлада ўпершыню ў свеце на дзяржаўным узроўні распачала спробу ажыццяўлення жаночай эмансіпацыі і карэннай змены сістэмы адносін паміж мужчынам і жанчынай. Важнае месца ў вырашэнні гэтых задач адводзілася ўключэнню працоўных жанчын у будаўніцтва новага грамадства, у тым ліку за кошт арганізацыі іх ўступлення ў Камуністычную партыю. Паколькі ў Рэспубліцы Беларусь рэалізуецца палітыка гендарнай роўнасці, вопыт бальшавікоў, поспехі, цяжкасці і пралікі ў вырашэнні імі «жаночага пытання» могуць прадстаўляць цікавасць не толькі для гісторыкаў, але і для супрацоўнікаў органаў улады і кіравання.

Мэта работы – прааналізаваць палітыку, накіраваную на пашырэнне шэрагаў КП(б)Б за кошт працоўных жанчын, і яе вынікі, дасягнутыя да канца 1920-х гг.

**Матэрыял і метады.** Крыніцамі паслужылі матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, публікацыі ў перыядычным друку, а таксама статыстычныя матэрыялы і дакументы, апублікаваныя ў зборніках. Выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У сувязі з лініяй на ўзмацненне кіруючай ролі партыі ў сацыялістычным будаўніцтве ставілася задача ўсямернага пашырэння партыйных шэрагаў. Працоўныя жанчыны разглядаліся як адзін з рэзерваў росту партыі. Да моманту партыйнага перапісу 1922 г. у КП(б)Б налічвалася ўсяго 457 камуністак, што складала 7,8% ад агульнай колькасці яе членаў. Да 1924 г. іх колькасць вырасла ўсяго толькі да 500 чал. Ацэньваючы такую нязначную колькасць жанчын у КП(б)Б як прыкмету ігнаравання іх ролі ў сацыялістычным будаўніцтве, партыйныя арганізацыі спрабавалі пераламіць сітуацыю. Так, па ленінскім прызыве ў 1924 г. кандыдатамі ў члены партыі былі прыняты 172 жанчыны [4, с. 47]. Пры гэтым цал-

Репозиторий ВГУ

кам выключаўся самацёк і ўкараняўся кіруемы працэс прыёму ў партыйныя шэрагі. Як адзначалася ў часопісе «Бальшавік Беларусі», «мы за бальшавіцкае рэгуляваньне росту і за актыўную вярбоўку» [10, с. 35].

У дачыненні да жанчын «рэгуляваннем» сацыяльнага складу і «вярбоўкай» кадраў займаліся жаночыя аддзелы партыйных камітэтаў. Жанаддзел ЦК КП(б)Б вызначыў норму ўключэння ў партыю жанчын. На нарадзе супрацоўнікаў жанаддзела ЦК 14 жніўня 1924 г. было вырашана ўсталяваць квоту ўключэння ў КП(б)Б сялянак у 10–15% ад агульнай колькасці ўцягваемых сялян. У дачыненні да работніц і жонак рабочых палічылі немэтазгодным вызначаць у цэнтры пэўную лічбу для кожнага павета, акрэслілі ў цыркуляры агульны максімальны лік [6, арк. 12]. Устаноўкі па сацыяльным адборы вытрымліваліся няўхільна. Па стане на 1 красавіка 1930 г. у складзе жанчын-камуністак работніц быў 51%, сялянак 10,9%, служачых 29,7%, іншых 8,4% [10, с. 55].

Партыйная прапаганда пастаянна ўказвала на актыў работніц як невычэрпны рэзерв росту партыі. Да яго адносілі ўдарніц вытворчасці, савецкі, прафсаюзны, кааператыўны актыў, удзельніц дэлегацкіх сходаў. Але масавага прытоку жанчын у КП(б)Б не адбылося, што з'явілася вынікам шэрагу прычын.

Не апраўдаліся надзеі на дэлегацкія сходы як масавую крыніцу папаўнення партыйных шэрагаў. На працягу 1927/28 года кандыдатамі ў члены партыі былі прынятыя 184 дэлегаткі, у той час як удзельнікамі дэлегацкіх сходаў былі 27 980 жанчын [5, с. 2]. У 1930 г. з агульнай колькасці прынятых у партыю былі ў мінулым ці з'яўляліся на той час дэлегаткамі ўсяго 6% работніц прамысловых прадпрыемстваў, 13,7% калгасніц, 18,3% работніц саўгасаў і батрачак [2, с. 45].

Многія партарганізацыі наогул не займаліся ці мала займаліся папаўненнем партыйных шэрагаў за кошт жанчын. У канцы 1920-х гг. прыём сялянак у партыю не ажыццяўляўся ў шэрагу акругаў рэспублікі (Мінская, Віцебская, Гомельская, Магілёўская) [6, арк. 4]. Не палепшылася сітуацыя і ў далейшым, нават нягледзячы на рашэнне XII з'езду КП(б)Б (люты 1929 г.) «с большей решительностью вовлекать работниц, батрачек, крестьянок-колхозниц и беднячек в партию» [3, с. 92]. У чацвёртым квартале 1930 г. 24 партыйныя арганізацыі не прынялі ніводнай жанчыны, а 35 – ад 1 да 3 [10, с. 41].

Практыка паказала, што пры персанальным адборы кандыдатак на ўступленне ў партыю даводзілася пераадольваць істотныя бар'еры. У адных выпадках гэта было ўласнае няўвер'е ў здольнасць і неабходнасць займацца грамадскай дзейнасцю, у другіх – сумненні партячэйкі ў адукацыйнай і ідэалагічнай падрыхтаванасці работніц і сялянак, у трэціх – прадузяты, нягледзячы на дырэктывы ЦК КП(б)Б, падыход да прыёму жанчын у партыю. На І Усебеларускай нарадзе камуністак-работніц прадпрыемстваў, якая прайшла ў красавіку 1929 г., прыводзіліся факты адмовы ў прыёме па відавочна надуманых матывах: на фабрыцы «Везувій» не прынялі ў партыю работніцу, таму што «она плохо по-русски говорит», яшчэ на адным прадпрыемстве выказалі недавер з-за таго, што «она с парнем по улице прошлась», недахоп іншай угледзелі ў тым, што «она не умна», у трэцяй муж, з якім жанчына ўжо не жыла, «растратил деньги» [1, с. 4].

З прычыны дыскрымінацыі жанчын у партыйных арганізацыях прамысловых прадпрыемстваў пераважалі мужчыны. Так, жанчыны ў складзе прамысловых рабочых буйных прадпрыемстваў складалі 35%, а ў партыі – усяго 12,5% [10, с. 44]. Па дадзеных на пачатак 1930 г. не было ніводнай галіны прамысловай вытворчасці (акрамя керамічнай), у агульнай колькасці рабочых якой удзельная вага жанчын у складзе членаў і кандыдатаў у члены КП(б)Б пераўзыходзіла б удзельную вагу мужчын [8, с. XVIII]. У сельскіх партыйных арганізацыях жанчын было нашмат меней, чым у гарадскіх.

У цэлым, работа па ўцягненні жанчын у КП(б)Б прыносіла досыць сціплыя вынікі. Іх працэнт сярод ізноў прынятых у партыю быў нязначны: у 1927 г. – 12,5%, у 1928 г. – 12,8, у 1929 г. – 16,2, у 1930 г. – 13,4% [10, с. 44]. Невысокія тэмпы прыёму вызначылі нізкую ўдзельную вагу жанчын у КП(б)Б. Хоць на працягу 1920-х гг. на фоне агульнага росту партыі лік камуністак ўзрос, яны заставаліся ў абсалютнай меншасці: у 1922 г. у партыйных шэрагах было ўсяго 457 (7,8%) жанчын, у 1930 г. – 4548 (12,5%) [4, с. 168].

Жанчыны, прынятыя ў КП(б)Б, мелі пэўную магчымасць прасунуцца ў партыйнай іерархіі. Але ў цэлым прадстаўніцтва камуністак у выбарных органах партыі было нізкім і да канца 1920-х гг. не мела тэндэнцыі да павелічэння. Справаздачы аб праведзеных ў 1926 г. перавыбарах адзначаюць абсалютнае і адноснае памяншэнне колькасці жанчын у партбюро ячэек і



Репозиторий ВГУ

райкамаў Калінінскай, Мазырскай, Магілёўскай акругаў. У апошняй жанчын у складзе партбюро налічвалася ўсяго 6,6%. Толькі ў 1929 г. упершыню ў рэспубліцы сакратаром райкама партыі (у Смалявічах) была абраная жанчына – член ВКП(б) з 1919 г. Аронова, якая шмат гадоў да гэтага працавала загадчыцай жанаддзелаў розных партыйных камітэтаў [7, с. 11].

У вышэйшых эшалонах партыйнай улады жанчын заставалася зусім мала. На працягу 1920-х гг. у ЦБ КП(б)Б уваходзіла ўсяго толькі дзве жанчыны і адна з'яўлялася кандыдатам у члены Бюро ЦК. Гэта былі загадчыца аддзела ЦБ па рабоце сярод жанчын, член ЦБ КП(б)Б з 1 верасня 1920 г. да канца лютага 1921 г. І.А. Лебедзева; сакратар Мазырскага павятовага камітэта КП(б)Б, член ЦБ КП(б)Б з 1 сакавіка да 3 чэрвеня 1921 г. А.Я. Кажура; загадчыца жаночага аддзела ЦК, кандыдат у члены Бюро ЦК КП(б)Б у 1926–1927 гг. М.Ф. Муратава [9, с. 291–294].

**Заключэнне.** Такім чынам, ва ўмовах аднапартыйнасці рост жаночага прадстаўніцтва ў Камуністычнай партыі меў вялікае значэнне. Камуністкі станавіліся рэзервам гаспадарчых і савецкіх кадраў. Павелічэнне колькасці жанчын у партыі забяспечвалася праз выкарыстанне сістэмы квот. Але тут бальшавікам прыйшлося сустрэцца з аб'ектыўнымі цяжкасцямі, абумоўленымі панаваннем у грамадскай свядомасці патрыярхатных гендарных стэрэатыпаў. Дырэктывы цэнтральных органаў па вылучэнні работніц і сялянак часта сутыкаліся з пасіўнасцю выканаўцаў, а таксама з нізкім узроўнем актыўнасці саміх жанчын. Тым не менш, дзейнасць жанчын у партыі спрыяла разбурэнню ўяўленняў пра іх няздольнасць да паспяховай самарэалізацыі ў грамадскай сферы.


1. Браварник, И.С. Что сказало Всебелорусское совещание работниц-коммунисток / И. С. Браварник // Беларуская работніца і сялянка. – 1929. – № 11. – С. 3–4.
2. Гоўзман. Рост КП(б)Б у 1-м квартале 1931 г. / Гоўзман // Бальшавік Беларусі. – 1931. – № 7. – С. 49–57.
3. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. – Т. 2. 1928 – 1932. – Минск : Беларусь, 1984. – 511 с.
4. Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах: 1918 – 1988 / В. А. Бобков и др. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск : Беларусь, 1988. – 253 с.
5. Кустановіч, Л. Шматгаворачыя лічбы / Л. Кустановіч // Звязда. – 1928. – 26 жніўня. – С. 2.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 9. Спр. 11.
7. Первая женщина в БССР – секретарь райпарткома // Беларуская работніца і сялянка. – 1929. – № 17. – С. 11.
8. Рабочыя цэнзавай прамысловасьці БССР. – Менск : Дзяржплан БССР, 1930. – 75 с.
9. Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты / сост. Ю. П. Смирнов, Н. С. Сташкевич; под ред. Р. П. Платонова. – Минск : Университетское, 1990. – 446 с.
10. Танхілевіч, А. Тэмпы і якасць росту КП(б)Б / А. Танхілевіч // Бальшавік Беларусі. – 1931. – № 4. – С. 34–48.


## ФЕСТИВАЛИ НАРОДНОГО ТВОРЧЕСТВА В КОНТЕКСТЕ СОВРЕМЕННЫХ ТЕНДЕНЦИЙ РАЗВИТИЯ БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЫ


*О.М. Жукова*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Активизация белорусского фестивального движения во многом определилась переменами 1991 года и обретением Республикой Беларусь независимости. Именно в это время фестиваль стал рассматриваться как перспективное направление в развитии белорусской культуры, актуальная форма презентации различных видов искусств, эффективная поддержка возрождения и сохранения традиционной культуры и национального наследия. Особую значимость в этой связи приобретают фестивали фольклора и народного творчества. Активное участие в фестивалях профессиональных и самодеятельных коллективов, огромной зрительской аудитории позволяет говорить о данных мероприятиях как об актуальной, действенной и востребованной форме презентации искусства и художественного творчества. Фестивальное движение получило распространение на всей белорусской территории, охватывая не только крупные города, но и регионы.

Цель статьи – раскрыть значение фестиваля в контексте современных тенденций развития белорусской культуры.

**Материал и методы.** Материалом для данной статьи стал фактологический материал, полученный в результате анализа статей периодических изданий. В соответствии с целью статьи были использованы следующие методы: исторический, аналитический, компаративный, а также теоретический (обобщение), общенаучные логические (анализ, синтез, аналогия) и эмпирические (наблюдение, описание, сравнение).

Репозиторий ВГУ